НОВАЯ ДАРОГА

NEUER WEG

Preis 20 Pf. Weißruthenische Wochenzeitung für den Bezirk Bialystok Цана 20 фнг.

Беларуская тыднёвая газэта на Беластоцкую Акругу

Адрас рэдакцыі: Bialystok, Langgasse 16. Тэл. 1020, Банкконт Гарадзкая Каса Ашчаднасьці 700. Цана абвестак паводле тарыфу № 1.

№ 18. (104) Беласток, 30 красавіка 1944 Год выданьня III.

На рубяжы

«Няшчасны есьм дзеранін, згіб есьм! у [illegible], а больш з жалю: людзі на кашы парасьлі кашу, а я з голаду здох на старожы. Памсьці, Божа, гасудару грэхападзеньне, хто разумее, бо прыдзе час, калі будзе надоба Ільлі Мураўленіна і Салаўя Будзіміравіча, прыдзе час, калі будзе служб нашых патрэба».

ФІЛОН КМІТА.

У старадаўнай мінуўшчыне нашай, якіх чатырыста лет таму назад, на Смаленскіх заставах працаваў наш патрыёт Філон Кміта Чарнабыльскі. На рубяжы нашай Бацькаўшчыны ён выконваў адказныя дзяржаўныя заданьні тады, калі Беларусь знаходзілася ў стане бязупыннай абароннай вайны з экспансыўнай Масквой. За свае заслугі, аказаныя дзяржаве, Філон Кміта быў паднесены ў годнасьць сэнатара з тытулам ваяводы Смаленскага.

Зносячы [illegible] недахопы й бяду, ён верна і самаа[illegible] на варце Беларусі, ведаючы, што з [illegible] ёй пагражае небясьпека.

Як много [illegible] сягоньня гэтыя Смаленскія заставы [illegible] Бацькаўшчына [illegible] нашых палёў, хто толькі ня мучыў і ня крывавіў наш народ? Як наш паэта кажа:

«Тут схадзіліcь усе плямёны
спрэчкі сілаю канчаць,
каб багата адароны
край наш родны зваяваць».

Наш край знаходзіўся, сапраўды, на рубяжы двух сьветаў. І заўсёды ён быў прадпольлем эўрапэйскага сьвету, які баранілі нашыя продкі ў постаці Філонаў Кмітаў! Запаветы гэтых гэрояў-змагароў засталіся назаўсёды наказам для наступных пакаленьняў. Сягоньня мы ізноў зьяўляемся на адказным гістарычным становішчы. Ізноў пачаўся бой паміж двума адвечна-варожымі сьветамі: усходам і захадам. І так як калісь, так і сягоньня прыпадае гістарычная роля у гэтым змаганьні якраз нашай Бацькаўшчыне-Беларусі.

Праўда, умовы змаганьня зьмяніліся грунтоўна. Калі раней з дзідай і шчытом мог наш беларус вытрымліваць напор маскоўшчыны, то сягоньня вайну вырашаюць танкі, самалёты, падводныя лодкі, міны і г. п.

Але якое-б значэньне не адыгрывала ў сучаснай вайне тэхніка, усё-ж першае месца у ёй займае чалавек! Нямецкі жаўнер паказаў на працягу амаль пяці гадоў вайны сваю баяздольнасьць і самаадданасьць. Гэтыя якасьці нямецкага жаўнера, пры наяўнасьці незраўнанай нямецкай ваеннай прадукцыі, зьяўляюцца зарукай перамогі Нямеччыны.

Але перамога Нямеччыны — гэта перамога эўрапэйскага сьвету. У эўрапэйскім фронце ідзе і наш народ. Рубежнае палажэньне нашае Бацькаўшчыны якраз ускладае на нас [illegible] заданьне ў сучаснай вайне. Гэта ня [illegible], што Нямеччына якраз Беларускаму Народу дае цяпер зброю ў рукі. Беларускі народ на працягу свёй гісторыі паказаў, што ён зьяўляецца вартаўнікам парадку на ўсходзе Эўропы.

Узбраеньне беларускага народу—доказ шырокай нацыянальнай палітыкі Нямеччыны. Нямеччына пераканалася, што ў нашым народзе яна мае вернага саюзьніка. Беларускі Народ ведае добра, што вынік сучаснае вайны абазначае для яго жыцьцё або сьмерць. Будзе бальшавізм пераможаны — наш народ будзе жыць, у іншым выпадку—мы зыйдзем назаўсёды са сцэны гісторыі. Таму сягоньня [illegible] лы мы напружваем для перамогі над [illegible] візмам.

Небясьпеку [illegible] даўно [illegible]

А сягоньня [illegible] та ня толькі [illegible] шчыны-Беларусі, гэта [illegible] рапэйскіх народаў. Таму змаганьне, [illegible] мы сягоньня вядзем, нязвычайна адказнае. [illegible]ле ў ім мы не адны, у ім мы йдзем разам з усімі эўрапэйскімі народамі і ў ім, у гэтым змаганьні, якраз здабудзем сваю сьветлую будучыню.

Азброеная Беларусь сягоньня адна суцэльная застава!

Трымайма моцна яе, памятуючы запаветы нашых продкаў!

Наднёманскі.

Нэгры ў амэрыканскай арміі

Наводле афіцыяльных дадзеных з Вашынгтону, у арміі ЗША знаходзіцца зараз 700.000 нэграў. Гэта азначае, што дзесяць працэнтаў усіх баявых сілаў ЗША складаюць чорныя.

Пытаньне права голасу для нэграў у часе выбараў прэзыдэнта ЗША ў гэтым годзе належыць да найбольш спрэчных пунктаў выбарчага права.

Сэнатар Эляндэр з Люізыяны выказаў свой рашучы пратэст супроць права голасу для нэгрыцянскага насельніцтва. Ён гатоў у разе патрэбы гаварыць на гэтую тэму 125 гадзін папарад.

Вайна

Цяжкія, заўзятыя атакі бальшавікоў, якія яны праводзілі на працягу некалькіх тыдняў, каб выкарыстаць перадвясеньні час перад забалочанасьцю дарогаў, у апошні час значна аслаблі. Па-першае дзеля таго, што для іх паўсталі вялікія цяжкасьці з дастаўкай амуніцыі і харчоў, па-другое таму, што нямецкія і саюзныя войскі бліжэй падыйшлі да сваіх заспасабляючых базаў і зарганізавалі адпаведны супраціў, па трэцяе дзеля вялізарных стратаў у людзкім і ваенным матарыяле.

Нямецкія і саюзьніцкія войскі пачалі ўжо адкідаць ворага назад. Дык нічога дзіўнага, што Сталін заскрыгатаў зубамі. Маскоўскія газэты асабліва «Война и рабочий класс» пачалі вылізаць гэтую злосьць свайго бацюшкі на галавы сваіх хаўрусьнікаў — Чэрчыля і Рузвэльта. Маскоўскія крыважэры энэргічна зажадалі ад іх наступных рэчаў:

1. Яны мусяць націснуць на нэйтральныя дзяржавы, [illegible]усім на Швэцыю, каб яны перасталі гандляваць і наагул перарвалі дачыненьні з Нямеччынай.

2. Хаўрусьнікі мусяць урэшце рэшт прыступіць да належнай ваеннай акцыі, зактывізавацца па стаханаўску, бо кожны дзень, крыва[illegible]агі, ня можна болей дурака валяць [illegible] абходна прыступіць да — [illegible] фронту.

[illegible] фронце. Бязумоўна, Чэрчыль, як гаворыцца, рад старацца, пачаў — націскаць на нэйтральныя дзяржавы і даказваць ім, што гэта яны адказныя за вайну, бо, гандлюючы з Нямеччынай, прадаўжаюць яе.

Тымчасам бальшавікі прабуюць яшчэ на двох месцах з даволі вялікімі сіламі наступаць. Аднак нямецкія аддзелы аказваюць ім рашучы супраціў. Гэта перадусім раён Сэвастопаля і абшар ля Ціраспалю — Цігаіны — Ясаў. Гэты апошні адрэзак у ваенным паведамленьні называецца адрэзкам ля ніжняга Днястра. Нямецкае камандаваньне з свайго боку імкнецца палепшыць некаторыя адрэзкі ўсходняга фронту на сваю карысьць. Дзеля гэтага яно распачало цэлы шэраг контр-наступаў са значным посьпехам.

Асабліва на адрэзку між Карпатамі і верхнім Днястром з цэнтрам ля Станіслававa. Таксама на паўночным фронце ля Нарвы, дзе ў апошні час нямецкія аддзелы адкінулі ворага далёка назад. Бязумоўна, вораг будзе старацца яшчэ, калі пацяплее, сабраць сілы і ізноў распачаць афэнзыву, але гэтым разам ён спаткае ня толькі рашучы адпор, але і належную адплату.

Ужо некалькі дзён вораг вядзе заўзятыя наступы ў раёне Сэвастопалю з дапамогай вялікай колькасьці танкаў і баявых самалётаў. Аднак, усе іх атакі да апошняга часу скончыліся для іх толькі вялікімі стратамі ў людзкім і ваенным матарыяле. Толькі за два апошнія дні яны страцілі тут 67 танкаў і 89 баявых самалётаў. Таксама ў раёне ніжняга Днястра ўсе цяжкія атакі бальшавікоў скончыліся для іх поўнай няўдачай. Мясцовыя ўклінeньні былі пасьля контр-атакаў нямецкімі аддзеламі акружаны і зьліквідаваны. Вораг страціў пры гэтым шмат танкаў. На паўночны захад ад Ясаў нямецкія і румынскія аддзелы правялі неспадзяваную для ворага рашучую атаку, у выніку якой было зьнішчана 22 танкі, 70 гарматаў і захоплена звыш 600 палонных.

Між Карпатамі і Станіслававам нямецка-вугорскія аддзелы прадаўжаюць наступаць. У выніку гэтай акцыі, ня гледзячы на заўзяты варожы супраціў ад яго былі адбіты гарады: Надворна і Атынія. На паўдзённы-захад ад Луцка нямецкія аддзелы ня толькі адбілі ўсе атакі ворага, але самы перайшлі ў контр-атаку і занялі некалькі мясцовасьцяў.

На паўдзённы-захад ад Ковэлю пасьля некалькіх дзён цяжкіх баёў, сярод цяжкіх тэрэновых умоваў, была акружана і поўнасьцю зьнішчана адна бальшавіцкая кавалерыйская [illegible] забітых, самалётаў [illegible] палонных.

На сярэднім адрэзку фронту [illegible] на спэцыяльная акцыя супроць бандытаў [illegible] выніку якой было звыш тысячы забітых і звыш ста іх лягераў зьнішчана. За мінулы тыдзень бальшавікі страцілі 163 танкі, 209 самалётаў і 148 гарматаў. На італьянскім фронце не адбылося ніякіх паважнейшых дзеяньняў. Толькі каля прадмосьця Нэттуно, на паўдзённы-ўсход ад Апрыліі англа-амэрыканцы прабавалі з дапамогай танкаў наступаць. Гэтая спроба была зьнішчана агнём нямецкай артылерыі.

Нямецкія ваенна-марскія сілы правялі нечаканую для ворага атаку на порт Анціо. Пасьля кароткага бою затоплена адна варожая карвэта, адзін параплаў старпэдаваны і спрычынены вялікія шкоды партавым уладжаньням. На Адрыятычным пабярэжжы нямецкія ўдарныя аддзелы пранiклі ў становішчы ворага, зьнішчылі некалькі яго апорных пунктаў і спрычынілі яму вялікія страты. Нямецкія баявыя і тарпэдныя самалёты правялі цяжкі напад на канвой варожых караблёў ля паўночна-афрыканскага пабярэжжа. У раёне Алжыру яны затапілі два варожыя зьнішчальнікі, 4 фрахтары на 29.000 БРТ і 1 вялікі танкер, а 13 гандлёвых караб-

(Працяг на 2-й бачыне).

Процілятунская артылерыя ў Нарве.
Падчас атакі савецкага лятунства на Нарву, жаўнер абслугоўваючы процілятунскую гармату быў ранены. Падвязаўшы галаву, ён, ня гледзячы на рану, не пакінуў свайго становішча.



Валёнскія дабраахвотніцкія аддзелы SS на бацькаўшчыне.
Валёнская штурмовая брыгада SS, каторая вырвалася з мяшку пад Чэркасамі, вярнулася на бацькаўшчыну і праходзіць каля гелды ў Брусэлі.

Над сьвежай магілай

Ворагі, бачачы нашыя посьпехі ня толькі ў галіне культурнага будаўніцтва, але і на міжнароднай арэне, у бязсільнай злосьці сьціскаюць зубы і імкнуцца ў канвульсіўных сударгах пашкодзіць нашаму поступу наперад. Яны ў гэтай агоніі выкарыстоўваюць розныя подлыя мэтады, якія сьведчаць толькі аб іх нікчэмнасьці і маральным апусташэньні.

Сярод гэтых подлых мэтадаў тэрор зьяўляецца для іх найбольш магчымай помстай. Забіваючы нашых найбольш сьвядомых і актыўных людзей, яны думаюць гэтым самым перашкодзіць нашай справе.

Нядаўна нам удалося знайсьці труп забітага некалькі месяцаў таму назад доктара філёзофіі Міколы Чарнэцкага.

Мы стаімо цяпер перад гэтым жудасным фактам — перад магілай яшчэ аднаго дачасна згінуўшага барацьбіта за вызваленьне нашага белрускага народу. Беларуская грамадзкасьць, сябры і знаёмыя прышлі аддаць свой апошні доўг яго сьветлай памяці.

Сьв. пам. др. Мікола Чарнэцкі, як і большасьць нашае народнае інтэлігэнцыі, прайшоў цяжкі жыцьцёвы шлях. Шмат труднасьцяў і перашкодаў прыходзілася перамагаць Яму, каб прабіць сабе дарогу да асьветы. Паходзячы з сялянскага асяродзьдзя, Ён з уласьцівай нашаму сялянству ўпартасьцю і працавітасьцю імкнуўся да сьвятла навукі. Будучы шчырым сынам свайго народу, Ён ужо з юнацкіх гадоў прыймае актыўны ўдзел у беларускім вызвольным руху у 1917—20 гадох, з вінтоўкай у рукох змагаючыся за незалежнасьць нашай Бацькаўшчыны.

Калі-ж наш вызвольны рух быў задушаны нашымі ворагамі, Яму, ясна, ня было месца на сваёй Радзіме. Ён, разам з другімі нашымі змагарамі, мусіў эміграваць Апынуўшыся ў Празе Чэскай, Ён і там думаў толькі аб адным — аб шчасьці і сьветлай долі нашага народу. Будучы студэнтам, ён актыўна працуе ў рэвалюцыйнай беларускай партыі, якая рыхтавалася [illegible] актыўнага змаганьня з нашымі ворага[illegible] Ён [illegible]ывае вышэйшую асьвету і канчае філялягічны факультэт Карлаўскага унівэрсытэту ў Празе.

Вярнуўшыся на Бацькаўшчыну, Ён апынуўся ў надзвычай цяжкіх матарыяльных варунках. Але ня гледзячы на гэта, Ён і тут, не пакладаючы рук, працуе для беларускай справы, гуртуючы вакол сябе студэнтаў і моладзь. Ён з надзвычайным уменьнем і спакойна, без непатрэбнага шуму, але з пераканаўчай сілай і разважнасьцю, захапляў сваіх аднадумцаў. Хто спатыкаўся з ім, заўсёды выносіў уражаньне, што гэта станоўкі, нязломны і высокасьвечаны змагар.

Перажыўшы ўсе жудасьці бальшавіцкага панаваньня, сьв. пам. др. Мікола Чарнэцкі, адразу-ж пасьля прыходу нямецкае арміі, з энэргіяй і запалам прыступіў да адбудовы нашай Бацькаўшчыны, працуючы актыўна і бязупынна ў Беларускім Аб'еднаньні ў Беластоку.

Цяжкія матарыяльныя ўмовы жыцьця не дазволілі сьв. пам. др. Чарнецкаму заняцца навуковай працай. Беларускае грамадзтва, аднак, ведае добра Яго, як паважную навуковую сілу. Сваімі радамі і практычнай дапамогай Ён вядомы ўсім беларускім навукоўцам, як гісторык і мовавед. Любоў да свае роднае мовы была ў ім асаблівым нахілам. Ён быў адным з рэдкіх знаўцаў беларускае мовы і пашану і любоў да яе прышчапляў у кожным, з кім спатыкаўся. Яго дактарская праца «Вайна за Смаленск», якая, бязумоўна, будзе апублікавана, узбагаціць нашую гістарычную навуку.

Калі сьв. пам. др. Чарнэцкі быў для нас высокавартаснай і дарагой асобай, дык нічога дзіўнага, што нашы ворагі Яго ненавідзелі і прасьледавалі. Тры месяцы таму назад недалёка ад Беластоку Ён быў зьверскі закатаваны нашымі заклятымі ворагамі. Толькі нядаўна, дзякуючы дапамозе мясцовых беларускіх сялян, труп яго ўдалося знайсьці.

24-га красавіка сьв. пам. др. Чарнэцкі быў пахаваны на праваслаўных могілках у Беластоку.

Яшчэ адна сьвежая магіла! Яна застанецца назаўсёды помнікам безгранічнай адданасьці для свайго народу і будзе клікаць нас да нястомнае працы і помсты!

Сьпі спакойна, наш Дарагі Сябра! Чэсьць Тваёй памяці!

«Любіць свой край — яго лясы, палі, зялёныя яго шырокія лугі, сенажаці, яго бязьлічныя ўзгоркі і кароткія даліны і ўвесь чар, якім абвеяна ўсё гэта,— трэба палюбіць і навучыцца любіць стала ўсё мацней і адданей толькі сьведама, разважна, разумна. Толькі такая любоў можа быць зарукай, што той ці іншы сын народу ня здрадзіць яго, што ў выпадку неабходнасьці, ён зможа аддаць за свой народ і край найвялікшы свой скарб — жыцьцё. Гэты чалавек багаты духова, ён далёкі ад таго бруднага, агіднага мяшчанства, калі за асабістыя выгады чалавек гатоў зьмяніць сваю нацыянальнасьць.

Калі нас у мінуўшчыне за любоў да свайго краю й народу каралі і [illegible] лі, саджалі ў турмы, то цяп[illegible] павінна разьвівацца любоў да [illegible] роду інтэнсыўна.

Ворагі нашы вядуць цяпер асабліва зацятае змаганьне з намі. Яны ўсялякімі спосабамі стараюцца вынішчыць сьведамыя й актыўныя сілы, каб гэтым самым расчысьціць дарогу для сваіх брудных намераў і стрымаць беларускі рух. Але ня ўдасца ім гэта! Наадварот, яны будуць зьнішчаны, бо жыў беларус і будзе жыць. І верныя сыны Беларусі дачакаюцца свайго яснага дня.

Бацькаўшчына чакае. Чакае, што яе дзеці прыдуць з сьветлымі думамі, з чыстымі замерамі, дружна і ахвотна стануць да направы свае занядбанае долі, стануць да імклівае працы, каб вынішчыць якнайхутчэй з родных палеткаў векавое ліхазельле. Але прыгэтым ня трэба спадзявацца, што гэтую лепшую долю, як вялікоднае яечка нам хтось прынясе і бязінтэрэсоўна дасьць, — нашая ўласная доля ад нас самых залежыць. Дзеля гэтага не забывайце, што Бацькаўшчына ўсьцяж чакае на вас!»

(Др. М. Чарнецкі «Бацькаўшчына чакае!» «Новая Дарога» № 23 1942 год).

Плячо ў плячо з Нямеччынай

22 чэрвеня 1941 году распачалася новая эра ў жыцьці Беларускага Народу. Гэты дзень стаўся днём вызвальеньня нашага народу з-пад жыдоўска-бальшавіцкага ярма. Бальшавікі і іх прыхвасьні з хуткасьцю маланкі беглі ў сваё ваўчынае гняздо — Крэмль. З гэтага часу над Беларусьсю засьвяціла яснае сонца, якога ня бачыў наш шматпакутны народ ужо 25 год. Беларусь, дзякуючы нямецкім жаўнерам, уступіла на свой доўгачаканы шлях палітычна-нацыянальнага разьвіцьця. З таго часу прайшло ўжо амаль 3 гады. Мы, беларусы, маем вялікія дасягненьні ў галіне разьвіцьця свайго нацыянальна-культурнага, гаспадарчага і палітычнага жыцьця. Праўда, усе гэтыя нашыя дасягненьні не дасталіся нам лёгка, для гэтага патрэбна была вялікая і клапатлівая праца, а да таго яшчэ і людзі, якія-б змаглі паставіць нашу адраджэнскую справу на правідловы шлях. Ня гледзячы на вялікую колькасьць зьнішчанай інтэлігэнцыі «дабрадзеямі» з Польшчы і Масквы, у нас яшчэ засталася армія арганізатараў, якія і распачалі сваю працу, клічучы да яе і ўсю іншую сьвядомую частку беларускага народу. Сіламі беларускіх арганізацыяў за гэтыя тры гады прароблена вялікая нацыянальна-культурная і арганізцыйная праца. Беларусь сталася поўнасьцю нацыянальнай. Аб гэтым гавораць нам створаныя беларускія школы, дзе нашы дзеці пасьля шматгадовага паняволеньня сталі йзноў вывучаць сваю ўласную мову дзядоў і прадзедаў. Усюды відаць нацыянальны ўздым і разьвіцьцё прыгнечанай да гэтага часу нацыі. Толькі цяпер Беларусь змагла стаць праўдзівай і нацыянальнай. Праўда, нашым ворагам гэта не да спадобы. Яны крычалі на ўсё горла, што мы, беларусы, нічога ня варты. Але памыліліся «паны з Польскі», ды «таварышы з Масквы». Яны думалі, што вымардаваўшы нашых арганізатараў, мы беларусы будзем нічога ня варты. Але ў нас аказалася шмат новых сілаў, загартаваных у барацьбе. Толькі ў змаганьні за волю, за правы і паўстае, умацоўваецца і арганізоўваюцца падняволеныя. Так і мы! Барацьба супроць сваіх вечных ворагаў навучыла нас быць паваротлівымі, навучыла нас любіць сваю Бацькаўшчыну. Пралітая кроў Беларусоў — нашых братоў, бацькоў і суродзічаў, прымусіла нас у гэты гістарычны для нас час таксама ўзяцца за зброю. Арганізацыя свае ўласнае Краёвае Абароны дапаможа нам канчаткова отварыць адзіную беларускую дзяржаву і зьяднаць беларусоў у адзін цэнтр, як з усходніх, так і з заходніх абшараў. Акрамя гэтага нам, беларусам, патрэбна свая ўласная вайсковая адзінка і для барацьбы з сучаснымі нашымі ўнутранымі ворагамі, якія ўсімі сіламі стараюцца папсаваць нашае адраджэнскае жыцьцё і пасеяць недавер паміж намі і Нямеччынай, дзякуючы якой мы ідзём у сваю сьветлую будучыню. Калі сталінскі выблюдак Панамарэнка, які нічога супольнага не павінен-бы мець з беларусамі, гаворыць, што праўдзівыя беларусы эвакуаваліся разам з імі, г. зн. з жыдамі, то няхай ён брэша гэт сабе. А мы добра ведаем, што праўдзівыя беларусы толькі і асталіся на сваёй роднай Бацькаўшчыне, а ўцяклі такія самыя выблюдкі, як і Панамарэнка, баючыся народнай расправы. Сёньня нам усім зразумела, хто наш прыяцель, а хто вораг. І таму мы рашуча і цьвёрда ўпэўнены, што праўда на нашым баку. Мы будзем за яе змагацца плячо ў плячо разам з Нямеччы[illegible] пе[illegible]раможм, або згінем, але ні на якія кампрамісы ня пойдзем!

Жыве Беларусь!

Наш дарагі прэзыдэнт
РАДАСЛАЎ АСТРОЎСКІ

[illegible]а Беларускай [illegible]кага народу, [illegible] яшчэ ў 1918 [illegible]ускіх дзеячоў [illegible]ветлай будучыні.

[illegible]рускі народ, ня гледзячы на зьдзекі, кайд[illegible]ы, ссылкі, турмы і сьмерць, ня гледзячы на духовае зьнішчэньне беларускай душы з боку жыда-бальшавіцкіх і польскіх уладароў, не скарыўся і не аддаў сябе ў рукі гэтым прыгнятальнікам. Сілу духу беларускага народу не ўдалося паралізаваць.

Прэзыдэнт Радаслаў Астроўскі кажа:

«Ім удалося скаваць, аднак толькі цела народу — дух-жа ягоны застаўся вольны.

Гэты дух лунаў над нашым краем і даваў яму жыцьцёвую сілу дзеля пэратрываньня ўсіх ліхалецьцяў новае няволі. Гэты-ж дух дапамог нам пэратрываць жудасныя часы бальшавіцка-польскага гнёту.

Аднак сваімі собскімі сіламі вызваліцца ад яго мы не маглі. Патрэбна была помач звонку. І яна прыйшла ў пару...»

Беларускі народ стаў вольным ад ланцугоў жыда-бальшавіцкага і польскага паняволеньня. Ня гледзячы на цяжасьці, ён за гэты кароткі час вельмі многа чаго зрабіў.

Толькі той факт, што ён самаахвярна працуе для дабра сваёй Бацькаўшчыны, грудзьмі стаіць у барацьбе з бальшавіцкімі бандамі сьведчыць аб тым, што ён хоча быць гаспадаром свайго краю.

На практыцы перажыўшы жудасьці жыда-бальшавізму, ён ня хоча сталінавай «апекі».

Прэзыдэнт Радаслаў Астроўскі падкрэсьлівае, што беларускі народ:

«...дарма што вайна, набрў сілы і ўзьняў крыльлі да самастойнага лёту, для змаганьня за сваё, так брутальна стаптанае права вольнага жыцьця».

У жыцьці беларускага народу наступіў вялікі гістарычны момант, калі выпала вялікае шчасьце для беларускага народу ўтрымаць дабытую ўладу і сваімі ўласнымі рукамі закладаць трывалы фундамант для сваёй Бацькаўшчыны. Гэтае змаганьне апошняе, рашучае. Прэзыдэнт Астроўскі яскрава прамовіў да свайго народу:

«Надыйшла вырашальная часіна, калі важыцца ўжо не пытаньне аб ролі, ці няволі, але пытаньне, быць ці нябыць — жыць, ці загінуць, ды пры гэтым згінуць ня толькі асобным адзінкам, якія не падпарадкаваліся загадам чырвонай Масквы, а даслоўна усім без вынятку — усяму беларускаму народу.

Такі плян апрацавала і такі загад вы[illegible]ючы свой народ [illegible] аканчальную перамогу Радаслаў Астроўскі [illegible]заў:

«Браты беларусы, камандзіры і стральцы Б. К. А., нашыя суродзічы на тым баку фронту, што ізноў лучылі ў бальшавіцкую пакуту, тыя, якіх доля закінула на чужыну за межы Бацькаўшчыны, усе тыя партызаны, у якіх б'ецца чэснае беларускае сэрца, а якія апынуліся ў лясох, агулам кажучы ўвесь беларускі народ, гуртуй свае сілы дзеля канчальнага змаганьня за сваё жыцьцё, за будучыню сваёй Бацькаўшчыны! Слухайце і выконвайце загады Б. Ц. Р., якая сяньня зьяўляецца адзіным агульна-беларускім нацыянальным цэнтрам! Ідучы адзіным фронтам, мы здабудзем сабе права на вольнае і самастойнае жыцьцё».

Беларускі народ глыбока ў сэрцы носіць словы свайго прэзыдэнта Радаслава Астроўскага. Ён ведае небясьпеку жыда-бальшавізму. Ён хоча вольна жыць і быць гаспадаром свайго краю. Таму, менавіта, беларускі народ самаахвярна, чэсна і самааддана выконвае свой вялікі абавязак перад Бацькўшчынай. Ён верыць у сваю перамогу, ён верыць у нямінучую сьмерць бальшавізму.

А. УСАЙСКІ.

(«Вайна» — працяг з 1-йба чыны)

лёў на 103.000 БРТ і 2 вялікія ваенныя транспартныя караблі і 3 зьнішчальнікі цяжка пашкодзілі.

Амэрыканскае лятунства два разы бамбардавала Букарэшт. Сярод насельніцтва былі страты. Было зьбіта 44 варожых бамбавікоў. Англаамэрыканскае лятунства праводзіла далей свае тэрарыстычныя налёты на гарады Нямеччыны. Асаблівыя шкоды ў жыльлёвых памешканьнях і страты сярод людзей былі спрычынены ў Касэлі, Кёльне, Дюсельдорфе, Кобленцы, Гаму, Вене, Мангайме, Карльсруэ і Мюнхэне. Прыгэтым плютакратычныя гангстэры стpацілі 374 баявыя самалёты.

Нямецкае баявое лятунства некалькі разоў цяжка бамбардавала Лёндан, Брыстоль і порт усходняе Англіі — Гэль.

Ад разрыўных і запальваючых бомбаў тут паўсталі вялікія зьнішчэньні і пажары.

Масква супроць нэйтральных дзяржаў

Масква цікавіцца зараз таксама гаспадарчай афэнзывай плютакратыі скіраванай супроць нэйтральных дзяржаваў і зьвяртаецца да саюзьнікаў з заклікам, застасаваць яшчэ гастрэйшыя мерапрыемствы. Маскоўскі часопіс «Война и рабочий класс» зьмяшчае поўны абурэньня артыкул, у якім гостра крытыкуе ўрады пэўных нэйтральных дзяржаваў, якія ня гледзячы на запэўненьні аб нэйтраліцеце, супрацоўнічаюць з Нямеччынай. Часопіс нападае асабліва на Швэцыю. Апрача гэтага «Война и рабочий класс» прыпамінае нэйтральным урадам, што яны ня ўмелі зразумець перасьярогу Гульля.

Адначасова крэмлёўскі орган заклікае саюзьнікаў да ўзмоцненай актыўнасьці таксама і ў вайсковых адносінах.

З УСЯГО СЬВЕТУ

✦ У Вугоршчыне абвешчана агульная палітычная амныстыя, пад якую падпадаюць усе дакананыя перад абвешчаньнем амныстыі палітычныя праступніцтвы, акрамя здрады краю й ўзрываў.

✦ З Жэнэвы паведамляюць аб моцным паветраным цыклёне (торнадо), ахвярамі якога палі на плошчы ў 100 квадратных міляў, 38 забітых і больш за 500 раненых асобаў.

✦ Ад 2-га сьнежня 1941 г. у Злучаных Штатах Амэрыкі згінула ў выніку нешчасьлівых выпадкаў 220.000 асобаў.

✦ З Мэксыкі паведамляюць, што прэзыдэнт Сальвадору забараніў спэцыяльным дэкрэтам выдаваньне ўсіх газэтаў краю, акрамя ўрадовага органу «Діаріо Нуэво». Гэтая забарона ўгрунтована тым, што сальвадорская прэса зьяўляецца адказнай за апошнія рэвалюцыйныя выбухі.

✦ Як паведамляе агенцтва Домэі з індуска-бурманскай граніцы, японскія і нацыянальна-індускія аддзелы здабылі ў выніку цяжкіх баёў горную крэпасьць Тэгнатуг.

З БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ

Беласток

БЕЛАРУСКІ БАЛЕТ

Пры Беларускім Аб'еднаньні ў Беластоку існуе балет. Выступленьнямі яго карыстаюцца ня толькі жыхары Беластоку, а балет час ад часу выяжджае і на пэрыфэрыю, дзе, як і ў Беластоку, таксама карыстаецца ня меншай папулярнасьцю.

Ад 19. 4. 1944 г. да 23. 4. 1944 г. балет значна пашыраны і цікавай праграмай выступаў у Цеханоўцы, Семяцічах, Высока-Літоўску і Каменец-Літоўску. Жыхары гэтых мясцовасьцей мелі мгчымасьць, ня выяжджаючы ў Беласток, бачыць прыгожыя выступленьні балету.

Выступленьні Беларускага балету пад умелым кіраўніцтвам паважанай сп. Бэккер усюды карыстаюцца выключным посьпехам. Удзельнікі балету вельмі добра падрыхтаваны, свае нумары, нават самыя цяжкія, выконваюць выключна ўдала і вызываюць шмат воплескаў.

Нельга не ўпамянуць і аб выступленьнях 13-ці гадовага гарманіста, Стася, які, хоць яшчэ і нядаўна прыняты на працу ў Аб'еднаньне, але ўжо пасьпеў сваімі выступленьнямі вельмі зацікавіць публіку і карыстаецца ўпаўне заслужанай папулярнасьцю.

Белавеж

Дзень 7. 4. 1944 году надоўга застанецца ў памяці белавежцаў. У гэты дзень к 2 гадзінам апоўдні саля Белавежскага тэатру была напоўнена. Павінен быў адбыцца канцэрт і пастаноўка Белавежскай школы. Месцы ўсе былі заняты. Усе з нецярплівасьцю чакалі пачатку. Была пастаноўка п'есы «Зьбянтэжаны Саўка». П'еса была выканана добра. Хоць слухачы і стараліся ўстрымацца ад сьмеху, але гэта не заўсёды ім удавалася. П'еса ўсім вельмі спадабалася, аб чым сьведчылі ... незмаўкаючыя воплескі.

Пасьля заканчэньня п'есы выступаў хор, які прасьпяваў шмат патрыятычных народных песень. Потым вучні старэйшых клясаў выканалі некалькі беларускіх нацыянальных танцаў, як напр., «Лявоніха» і інш. Перад кожным выступленьнем харыстаў і танцораў вучні малодшых клясаў дэклямавалі беларускія вершы.

Сярод слухачоў прысутнічалі і немцы. Адзін з вучняў добра прадэклямаваў нямецкі верш, што ім вельмі спадабалася.

На заканчэньні праграмы выступіў прадстаўнік Беларускага Аб'еднаньня ў Беластоку, які ў сваёй прамове адзначыў задачы беларусоў у цяперашні гістарычны час. Ён, між іншым, адзначыў, якім чынам беларускі народ можа дабіцца палепшаньня свайго лёсу. Беларусы павінны шчыльна згуртавацца вакол Беларускага Аб'еднаньня ў Беластоку, бо толькі згуртаваны народ можа быць магутным. Зараз Беларускі народ атрымаў вялікае давер'е з боку Нямецкага Камандваньня і мае магчымасьць супольна з ім будаваць сваю шчасьлівую будучыню.

Ялаўка

Драматычны гурток пры Беларускім Аддзеле ў Ялаўцы 23.4.1944 г. наладзіў спэктакль, другі раз за сваё існаваньне. Была пастаўлена п'еса «Па рэвізыі» Крапіўніцкай.

У падрыхтоўцы спэктаклю, апрача актораў, актыўны ўдзел прынялі амтскамісар, старшыня аддзелу Ялаўкі сп. Кузьміцкі і сп. Руснак, як мастацкі кіраўнік.

Апрача мясцовага насельніцтва, на спэктаклі прысутнічалі амтскамісар, бауэфюрэр і госьці са Сьвіслачы. Прысутныя былі задаволены паказам п'есы. Асабліва ўдала выконвалі свае ролі Зося Жукоўская і Семянчук.

На заканчэньне выступіў з сваёй праграмай мясцовы канцэрт. Сярод аркестрантаў вызначыліся Каралеўскі і Зданчук.

Мастацкая самадзейнасьць ў Ялаўцы можа служыць прыкладам і для другіх, бо, трэба сказаць, што нацыянальная культурна-выхаваўчая работа ня ўсюды яшчэ добра пастаўлена.

МІХАСЬ ВОЛЬХА.

Дарогі

Многа так дарог ёсьць у жыцьці,
Многа так зваблівых сьцяжынак ...
А якой дарогай мне пайсьці,
Каб з вясною разам не загінуць?
На якія сьцежкі мне зьвярнуць,
Дзе спаткае сэрца маё слодыч?
Дзе ізноў мне шчасьцем зацьвітуць
Маладосьці страчаныя годы?
[illegible]
І ня сонца [illegible]
Пачуцьцё [illegible]
Радасьць пр[illegible]
Мары кветкамі ўсьцілаюць [illegible]
Кветкамі гараць жыцьця усход[illegible]
І ўстае ў іх [illegible]
Родная зямля
Беларусі,
Бацькаўшчыны роднай ...
Многа так дарог ёсьць у жыцьці ...
А мая,
І справмі, і працай,
За радзіму
Скрозь у бой ісьці —
Жыць і паміраць,
Пакутваць і змагацца!

Бэрлін, 7. 3. 1944 г.

З фота-камэрай па беларускіх вёсках Беласточчыны





Беларуская нацыянальная палітыка і нашы моваведы

З глыбокаю пашанаю беларускі народ заўсёды будзе ўспамінаць усіх тых нашых пісьменьнікаў і моваведаў, якія сваёй руплівай працай узьнялі нашу народную мову зноў на ступень мовы літаратурнае і дзяржаўнае. Праца літаратараў і моваведаў ідзе ў нас ужо больш за стагодзьдзе і на іхніх дасягненьнях, падмацаваных дасьледчай працай нашых этнографаў і гісторыкаў, вырас сучасны беларускі адраджэнчы рух. Аднак, далейшую кіруючую ролю ў беларускім руху занялі цяпер ужо беларускія палітычныя дзеячы, якія твораць тое, што мы можам ужо з поўнаю падставаю называць беларускай нацыянальнай палітыкай.

Беларуская нацыянальная палітыка сёньня ўжо ня ёсьць справай выпадковых адзінак, нявядома скуль увайшоўшых у беларускі рух. Сучасныя беларускія нацыянальна-палітычныя дзеячы арганічна зьвязаны з нашым народам і ягоным адраджэнчым рухам. Яны працавалі і паступова, на працягу доўгіх дзесяцігодзьдзяў, узрасталі на нашых вачох. Мы ўжо добра ведаем і іхнія дасягненьні і іхнія памылкі, і іхнія здольнасьці, і іхнія слабыя мейсцы і можам ужо амаль безпамылкова расставіць наш нацыянальна-кіраўнічы актыў на адпаведныя нахілам і здольнасьцям кождае адзінкі мейсцы працы.

Вялікую ролю для каардынацыі беларускае нацыянальнае палітыкі адыграў 25 год назад Усебеларускі Кангрэс, а затым Рада БНР і склікаyыя на працягу чвэрці стагодзьдзя, як у краю, гэтак і за межамі, беларускія зьезды і нарады, а таксама прэзыдыюм Рады БНР, які няспынна вёў сваю працу аж да пачатку сяньняшняе 2-е Ўсясьветнае вайны. Ад 21-га сьнежня 1943 году далейшае кіраваньне нацыянальнае беларускае палітыкі перададзена ўжо і знаходзіцца цяпер у руках Цэнтральнае Рады Беларусі, якая зьяўляецца праўнаю спадкаберцаю Рады БНР.

На фоне гэтае нацыянальна-палітычнае кансалідацыі беларускага грамадзтва і ўсяго беларускага народу асабліва кідаецца ў вочы тая дэзарганізацыя і блытаніна, якая на сёньняшні дзень усё яшчэ пануе ў нашай моваведзе. У гэтай дужа важнай галіне нашага нацыянальнага жыцьця ўсё яшчэ пануе гэткая сытуацыя, аб якой трапна кажа народная прыказка: «Хто кій узяў, той і капрал!» Да гэтага часу ёсьць у нас яшчэ паасобныя грамадзяне, а таксама і некаторыя моваведы, якія больш прызвычаіліся чыньнічаць старарэжымным капральскім кіём, чым цярплівымі і ўсіх пераконваючымі навуковымі довадамі. У справу навуковую ўносяць яны часамі зусім непатрэбны і шкодны для справы азарт, а нават і пэрсанальныя спрэчкі і лаянкі, якія адхіляюць увагу дыскусантаў у зусім іншы бок, ствараючы атмасфэру скандалу і лютае варожасьці. І часта-густа здараецца тое, што нават зусім добрыя і бясспрэчныя тэзісы падаюцца грамадзтву ў гэткай абразьліва-задзірлівай форме і тональнасьці, што ў людзей ўсыхвае ахвота ... ад гэтага рэжучага вуха гістэрычнага крыку і лаянкі.

Вось ляжыць перад маіма вачыма апошні нумар газэты «Раніца» (№ 12 (174) ад 19-га сакавіка 1944 году), а ў ім на двух бачынах надрукаваны аграмадны артыкул Охізмы — «Крыху каля рызаў і падрызьнікаў, «сьвятароў» і «цемняроў» (Ацемкі ўцьвеленага філёлёга) Ужо ад самага назову артыкулу гэтага робіцца неяк неякавата: калі-б на гэтак азначаную тэму пісаў кравец, або швачка, ці нават партамыйніца, дык ім, як спэцыялістым шыцьця ды мыцьця, і пяро ў рукі, але філёлёгу круціць носам каля рызаў і падрызьнікаў, хаця-ж бы і самых «сьвятарскіх», — нібыта неяк ня выпадае, бо гэта-ж — «не ў сваёй спэцыяльнасьці» праца! Але-ж можа гэта толькі гэткі няўдалы агаловак?

Пазнаёміўшыся з артыкулам, бачым, што філёлёг у дужа прыкры спосаб, абражаючы годнасьць праваслаўнага біскупа Апанаса Віцебскага і Полацкага, лае і зьдзекуецца з яго за тое, што гэты архірэй напісаў у баранавіцкую газэту «Пагоня» пісьмо, у якім прапануе адкінуць новастворанае В. Ластоўскім слова «сьвятар» і ў далейшым ужываць для назову праваслаўных сьвятароў стары назоў—«сьвяшчэньнік». Адначасна дастаецца і рэдакцыі газэты «Пагоня» за тое, што публікуючы гэтае пісьмо біскупа Апанаса Полацкага, яна абмяжавалася карэктна матываванымі довадамі за далейшае ўжываньне гэтага слова, а ня выступіла з лаянкай і ганебнымі закідамі.

Вось-жа пачнем з спрэчнага слова «сьвятар». Як яго трэба разумець? і дзе і ў якім значэньні яго трэба ўжываць?

Я — не філёлёг. Але ў траўні 1924-га году, калі «Падручны Расійска-Крыўскі (Беларускі) Слоўнік» Вацлава Ластоўскага быў яшчэ ў друку, апынуўся я на цэлы год, аж да траўня 1924 году, у латыскай турме за беларускую справу. У Рыскую турму прыслаў мне Ластоўскі свой толькі што надрукаваны ў Коўне слоўнік. Стары мой сябра ведаў, што будзе гэта для мяне вялікая ўцеха. За год адзіночнага сядзеньня меў я шмат часу на разваргі, пісаньне, чытаньне, а адначасна з усім гэтым і на падрабязнае азнаямленьне з слоўнікам Ластоўскага.

У выніку ўважлівага разгляду слоўніка паўстала ў мяне шмат пытаньняў, аб якіх потым гутарыў я ўвосені 1925 году з Ластоўскім падчас побыту свайго ў Коўне ды асабліва падрабязна гутарылі мы з Ластоўскім, калі ён у сакавіку і красавіку 1927 году больш месяцу пражыў у Рызе, дзе доўга хістаўся і разважаў над вырашэньнем пытаньня — куды ехаць: ці ў Вашынгтон да амэрыканцаў, куды ён быў запрошаны кіраваць рускі аддзел Вашынгтонскай бібліятэкі, ці ў Менск, куды яго запрасілі на пасаду неадменнага сакратара Інстытуту Беларускае Культуры, абяцаючы хутка пераўтварыць Інстытут гэты ў Беларускую Акадэмію Навук. Амэрыканская віза ўжо была пастаўлена на пашпарце Ластоўскага, але дачка й жонка не жадалі ехаць у Амэрыку, ды і сам ён больш жадаў аддацца шырокай навуковай працы, да якой імкнуўся ўсё жыцьцё. Дык выбраў ён шлях на Менск, куды і выехаў з Рыгі 25-га красавіка 1927 году.

Падчас нашых гутарак зьвярнуў я ягоную ўвагу на цэлы шэраг пропускаў і недакладнасьцяў у ягоным слоўніку, а паміж імі і на тое, што ў слоўніку няма беларускага тэрміну для расейскіх словаў: «духоўная асоба».

— Як-то няма? — адказаў мне Ластоўскі: — у мяне ёсьць слова — «сьвятар»!

— Але-ж вы яго ўжываеце для азначэньня слова: «сьвяшчэньнік».

— Дык гэта-ж — тое-ж самае!

— Не, ня тое-ж самае.

І вось з далейшае гутаркі высьвятлілася, што пад словам «сьвятар» Ластоўскі якраз і разумеў тое, што ў расейскай мове азначаюць двумя словамі: «Духоўная асоба». Высьветлілася, што Ластоўскі зусім не хацеў азначыць сваім навотворам «сьвятар» выключна права-

Спэкулянт

— Так вы маёй жонкі ня знаеце? Ну, то маеце шчасьце! Адно вам скажу: аўтамат, ня баба. Як гляне, так навылет чалавека прашыбе. А як яшчэ пусьціць у рух язык, ды, ня дай Божа, рукі, то і прапаў чалавек. І не затнецца нігды!

Аднойчы ўвечар прыйшлі да нас партызаны. Адзін увайшоў у хату, астатнія асталіся ў сенях і на двары. «Я чырвоны партызан», кажа да жонкі.

«Бачу сама, што «чырвоны», адказвае. «Ад людзкой крыві! Але ты ў мяне хутка пабялееш!» І сама за качаргу. «Да мы, цётка, нічога браць ня будзем, от, хлеба нам толькі дайце, калі ласка». «Хлеба вам, лодырам, хлеба?! А ты мне яго пасеяў? А ты мне яго памалаціў?» Ды ну качаргой пад носам яму махаць. Той, сапраўды, зьбялеў і пачаў адступаць да парогу. Тады і я з запечка вылез. А яна яшчэ больш расхадзілася: «Колькі яшчэ вас там ёсьць? Уваходзьце-ж у хату, ня стыдайцеся, лясныя кавалеры!» Заклялі толькі партызаны нядобрымі словамі, ды і пацягнуліся са двара. Больш да нас ніколі і не заглядалі. Ад гэтага часу суседы, што багатшыя, маю жонку начаваць да сябе запрашаюць. Паднясуць ёй для храбрасьці шкляначку, пасадзяць ля вакна, а самыя сьпяць спакойна. Наагул, я вам скажу, што калі-б я быў солтысам, то на варту толькі жаночую нацыянальнасьць вызначаў-бы. Здалёка партызаны абмылялі-б тады вёску. Ну, але ня гэта я вам хацеў сказаць. Я хачу толькі расказаць, як я спэкулянтам быў. Дык вось, гэта наймілейшая мая жонка ад якогасьці часу ўзьелася на мяне: «Ах ты, лежабок, ах ты, альфабат! І дакуль ты на печы будзеш ляжаць. Іншыя — другія мужчыны ўсяляк стараюцца, — хто з гэтта нацягаў, хто спэкуліруе, а ты, як калода, валяешся. Вун каваліха ў каракулавым пальце сьвіньням носіць, храмовыя боты на штодзень укладае. Аднаго пташынага, — ды што там пташынага, — кароўяга малака ім толькі хіба бракуе. Во! А твая асабістая жонка ня мае чым унутранасьцей прыкрыць. Такі з цябе мужык! На што, Стась-дудар, — жонкі ня мае і напэўна ніколі не ажэніцца, значыцца, не такі ўжо дурны, як вы яго маеце — [illegible] да кабет[illegible] кла[illegible]цца, жаночую сукенку з гэтта [illegible]рынёс і яшчэ якую — «скрып-шыны!»

— «Прынёс, та прынёс — адказваю ёй— але за тое, як дагнаў яго паліцыянт, дык аж за браму конна на ім выехаў, галёпа, ды ўсё шпорыў».

—«Ну, та што, але сукенкі такі не аддаў».

Адным словам, бабы не пераможаш. Згадзіўся я.

Назьбірала яна кошычак яец, зрабіла трохі масла, узяла на павер тры літры самагонкі, ну і яшчэ сёе-тое, вырабіла пропуск і адправіла мяне ў Горадню. «А як будзеш сядаць у поезд, дурная твая галава, дык ня ўлезь часам у нямецкі вагон, а шукай, дзе напісана «для полен», палякоў, значыцца».

Прывёз мяне хлапчук на станцыю, узяў я білет і ўціснуўся за людзьмі ў вагон. Шукаю я гэтак сабе мейсца ў ваднэй загародцы, у другой, аж тут нейкія два пісталеты заступілі мне дарогу.

— «Дзядзька, — кажуць — вы ня туды напалі, тут вагон для шпікулянтаў! Ідзеце вунь у другі!»

—«Нічога, кажу, усім месца хваціць» І сеў на лавачцы. Пачаў разглядацца. Бачу, што сапраўды самыя спэкулянты. Найбольш дзяўчаты і дзяцюкі малыя, ледва ад зямлі адрасьлі. А кожнае нешта ў кошыку мае.

Як толькі цягнік рушыў, гэтыя хлапцы ізноў да мяне: «Дзядзька, а што вы вязеце».

— А які, — кажу — твой, значыцца, інтэрас?

— Можа самагонку маеце?

— А хаця-б і меў, то што табе?

— Бо калі добрая, то мы вам добрага купца нараім!

— Та ўжо-ж ня ліхая.

— Пакажэце! Мы ёсьцека тутэйшыя пажарнікі, толькі бяз мундэіраў, і на гаручым вельмі добра знаемся. У ста процантах асвоілі. А ну, папробуем.

Папрабаваў адзін. «Добрая» — кажа, і перадаў другому.

Тут і я паверыў, што яны сапраўдныя мусяць быць пажарнікі, бо цягнулі, як помпа.

Ды з другіх загародак паналазілі зараз роз[illegible]ныя маскі, і пайшоў мой літар па рукох.

— «Хлопцы — кажу, чы маец[illegible] вы ўвесь літар расьпілі!»

— Не, ёсьць яшчэ трох[illegible]тар, а ў ім [illegible] усяго з поў[illegible] на дне. П[illegible]раўся гэта я, паўзіраўся, ды рэшту выпіў сам.

— Ну, кажу, вам то як вам, але мне за яго ад жонкі пападзе! А колькі каштуе літар?

— 30 марак.

— Ну, так трэба па совесьці разьлічыцца! Пачалі яны скідаць грошы, хто дзьве, хто тры маркі. Пералічыў я — усяго 19 марак.

Ну, дзякаваць і за тое. Ня дрэнныя, відаць, хлопцы, хоць і пажарнікі.

Адным словам, даехалі мы так да Горадні. Мае хлопцы давялі мяне да аднаго дамочка ў нейкім завулку і кажуць: «Зайдзеце ў другія дзьверы, там прадасьцё сваю самагонку!

Адчыняю я дзьверы, уваходжу. Бачу, на крэсьле нейкі чубарык сядзіць.

— Што патрабуеце? — пытаецца.

— Нічога. Я толькі паводлуг самагонкі, казалі мне, што вы купляеце.

— Пакажы сюды! Пачом хочаш?

— Па 30 марак, думаю!

— Добра, добра. Давай сюды, спэкулянцкая твая морда! А чы ты ведаеш, што я ў Астапа работаю і што за гэта магу пасадзіць цябе ў гэта!? Ды як затупаціць нагамі на падлозе. «Раус!», крычыць. Выракся я і самагонкі, хутчэй на вуліцу выскачыў і толькі там шапку на сябе налажыў. Вось, думаю, папаўся, хіба ня туды ўлез, дзе трэба. Добра, што хоць на гэтым толькі скончылася.

Іду я сабе так далей вуліцаю задуманы, аж спатыкаю аднаго перасяленца з нашае вёскі. Расказаў я яму пра сваю бяду, а ён кажа: «Дык гэта-ж жулік горадзенскі, ён у столяра Астапа працуе, а не ў Гэстапе. Ну, але скардзіцца ня радзіў-бы, можа і табе папасьці за спэкуляцыю.

Хай ён ёю зальецца!

Пайшлі мы з ім па рынак. Памог ён мне прадаць яйкі і масла. Накупіў я сахарыны, грэбянцоў запалак і рознае дробязі, бо на што лепшае ня было грошаў — і на цягнік.

Вярнуўся я да хаты. А жонка ўжо чакае: «Ну, паказвай, што накупіў?» Выняў я з кішані ўсё, што меў, і вылажыў на стол. Ды расказаў, як мяне абцыганілі ў Горадні. Што са[illegible]ной пасьля было, я ня памятую. Прыпаміна[illegible] толькі, што дзеці памаглі мне на печ узьлезьці. Ад таго часу не выпраўляла мяне больш [illegible]ляваць. Сама пачала езьдзіць. Дык вось [illegible] Пера[illegible], ці вы та[illegible] з Богам.

ШЭРШАНЬ.

Прачытаўшы, перадай газэту свайму Суседу!

Партрэт Сталіна

(З нядаўнай савецкай мінуўшчыны).

Раніца. Ціха прачнуўся гарадок К. Ажылі вуліцы. Сонца паднялося ўгару і заліло гарадок сваімі бліскучымі праменьнямі.

Усё было, як звычайна. Толькі на адной вуліцы было ня так. Прахожыя спалохана аглядаліся. Каля аднаго дому сабралася гурба людзей і на штось з зацікаўленьнем глядзела. Што гэта іх зацікавіла? Звычайная рэч — на сьцяне вісеў партрэт Сталіна. Звычайная рэч таму, што партрэтаў такіх нідзе не бракавала, і на сьценах дамоў, і ў вокнах, нават на хлявох і там падчас можна было ўбачыць «айца народаў».

Але ня ўтым справа: тут партрэт вісеў на адным з віднейшых месцаў вуліцы. Толькі само аблічча Сталіна было надзвычайнае. Вусы таварышу Сталіну хтось абарваў, вочы павыколваў, а ў зубох яго сядзела вялізарная трэска. Дрэнна відаць, прышлось гэтай ноччу таварышу Сталіну. Ды хто гэтак пасьмеў пасьмяяцца над «айцом народаў»? Але гэта ня ўсё. Унізе хтось асьмеліўся напісаць: «Тое, што заслужыў Сосо Джугашвілі». Сосо Джугашвілі... як гэта няпрыемна гучыць.

Ды, які ён Джугашвілі?! Бацька яго калісьці быў Джугашвілі, але ён зусім не Джугашвілі, а Іосіф Вісарыёнавіч Сталін «отец и учитель всех народов»!» Вось хто ён!.. Тут каля таварыша Сталіна людзей зьбіралася ўсё больш і больш. З натоўпу дзес[illegible] пачул[illegible] «так яму сабацы й трэба» і ўсе [illegible]ныя [illegible]ся дружным [illegible] з усіх старон пасы[illegible] пагрозы наконт «таварыша Ста[illegible]». А Сталін бледны, як сьмерць, з выкрыўленай фігурай, вісеў на абломаным цьвіку. Шкада толькі, што гэта быў усяго толькі партрэт. Ня ведама на чым кончылася-б, каб не падасьпелі энкавудзісты, якія разагналі таўпу і выручылі «таварыша Сталіна» з так прыкрага становішча.

На другі дзень Сталін ізноў вісеў на тым самым месцы, толькі воблік яго быў больш сур'ёзны. У заімглёных вачох яго малявалася нянавісьць. А сам Сталін, як-бы казаў: «Я вас праклятых закатую!»

КАЛІНА.

слаўнага сьвятара, а што гэтае дужа трапнае слова, аналёгічнага якому няма ні ў расейцаў, ні ў палякоў, павінна аднолькава адносіцца да духоўных асобаў усіх веравызнаньняў.

Ня меў ён намеру з дапамогаю новатвора «сьвятар» зусім адкінуць старыя спэцыфічныя назовы сьвятароў паасобных веравызнаньняў, замяняючы іх двумя словамі: праваслаўны сьвятар, каталіцкі сьвятар, лютаранскі сьвятар, мусульманскі сьвятар і гэтак далей. Старыя спэцыфічныя назовы маглі і могуць і надалей ужывацца, бо яны маюць тую перавагу, што праз адно слова адразу ўжо паказваюць, да якога менавіта веравызнаньня належыць даны сьвятар.

Якія-ж высновы павінны мы зрабіць з вышэйазначанага?

А высновы павінны быць гэткія:

1) Ластоўскі стварыў дужа трапны новатвор «сьвятар», які трэба ужываць як агульнае слова для ўсіх сьвятароў, як хрысьціянскіх, гэтак і нехрысьціянскіх. У гэтым значэньні й ужываў гэтае новае слова сам Ластоўскі, як лёгка кожны можа сам пераканацца, глянуўшы ў «Слоўнік». На балонцы 183-й знаходзімо: «Жрэц — паганскі сьвятар», на балонцы 292-й чытаемо: «Ксёндз — каталіцкі сьвятар». На балонцы 581-й надрукавана: «Рабін — жыдоўскі сьвятар».

2) Усе новатворы, што паходзяць ад слова «сьвятар», таксама павінны адносіцца да ўсіх веравызнаньняў наагул. Гэта азначае, што «сьвятарства» маюць усе «сьвятары» і ўсе яны «сьвятараць», а іхнія найвышшыя сьвятары могуць мець тытулы: «сьвятарнейшы», або «сьвятшы», у залежнасьці ад ступені сваёй дастойнасьці.

3) Памылка, ці дакладней кажучы — недагляд Ластоўскага быў у тым, што ён на балонцы 165-й свайго слоўніка, пасьля словаў «дух» і «духоўная», не надрукаваў свайго новатвору. Тут трэба было надрукаваць: «Духоўная асоба — сьвятар». А на балонцы 641 трэба было растлумачыць: «сьвяшчэньнік — праваслаўны сьвятар».

Гэтыя недакладнасьці, як і шмат якія іншыя, вызнаваў сам Вацлаў Ластоўскі, і ён абавязкава іх выправіў-бы, калі-б меў магчымасьць падрукаваць другое, больш поўнае выданьне свайго слоўніка, аб чым ён дужа клапаціўся.

4) Значыцца зусім безпадстаўна дамагаецца архірэй Апанас Полацкі, каб гожае слова «сьвятар» было выкінута з беларускага лексікону. — Не! Выкідаць яго ня трэба, хаця-ж гэтае слова і «выдумана Ластоўскім»! І калі-б знайшоўся яшчэ хто-колечы, які ўмеў-бы гэтак трапна і з гэткаю карысьцю для разьвіцьця беларускае літаратурнае мовы «выдумваць» новыя патрэбныя нам словы, як гэта зрабіў Ластоўскі, дык мы і гэткага чалавека шанавалі-б ня менш, як шануемо цяпер самога Ластоўскага.

5) Затое мае падставу архірэй Апанас, калі дамагаецца, каб праваслаўнага сьвятара называлі-б пастарому «сьвяшчэньнік», бо і каталіцкі сьвятар астаецца «ксяндзом», а сьвятары старавераў дагэтуль з гонарам носяць свой старадўні назоў «поп». Аднак з гэтага зусім не вынікае, што мы ня маем права, побач з назовам «сьвяшчэньнік», карыстацца ў выпадку патрэбы і апісальным двухслоўным азначэньнем «праваслаўны сьвятар».

Далей трэба сказаць колькі словаў аб моваведзе і нашай нацыянальнай палітыцы. Нашы моваведы, апрача навуковых досьледаў, павінны быць яшчэ троху пэдагогамі, палітыкамі і псыхолёгамі. Яны павінны ведаць і памятаць, што ніколі гвалтам, прымусам і лаянкай навуковыя дасягненьні ў масу не прасунеш. Патрэбны спакойныя і шматразовыя довады і паясьненьні, а не гістэрычны крык. Трэба памятаць, што нават найвялікшыя навуковыя вынаходы, дзеля сваёй нечаканасьці і навізны, часамі спатыкаліся грамадзтвам дужа варожа і толькі з часам і паступова знаходзілі сабе ўсеагульнае вызнаньне. Успомнім хаця-ж бы Каперніка, тэорыю якога ўрачыста праклялі, а яго самога ледзь было не спалілі біскупы Рымскага папы, а сёньня яму ставяць помнікі, як найлепшаму вучонаму.

У нас-жа часта-густа бывае так, што наш мовавед, знайшоўшы або стварыўшы дзе-што трапнае для беларускае мовы, жадае, каб усе і ўсюды зараз-жа, бяз ніякіх гутарак, хістаньняў і запытаньняў, схілілі свае галовы перад ягоным вынаходам і адразу-ж бы паўсюды правялі яго ў жыцьцё. Ня лічацца тады гэткія гарачыя моваведы ані з абставінамі часу, ані з адлегласьцю, ані з прызвычаенасьцю пэўных тэрытарыяльных акругаў і грамадзкіх кругоў нашае краіны да некаторых сваіх хвормаў, ані з тым нават, што на ўсё патрэбны час. На галавы ўсіх непаслухмяных і адстаючых выліваюцца памыі і ляцяць праклёны ды лаянка. І на вялікі жаль для ўсіх гэтых гістэрычных чынаў выкарыстоўваюцца балонкі агульнае беларускае прэсы, хаця-ж для гэтае справы трэба выпускаць спэцыяльныя выданьні.

Якія-ж вынікі ад гэтага паступаньня? — А вынікі дужа шкодныя для нашае справы. Бо, наперш, уносіцца залішняя нэрвовасьць і злосьць, якая псуе адносіны і раскалывае нашае грамадзтва на варожыя групкі. Падругое, новасьпечаныя новатворы ўжываюцца часамі ў тэй ці іншай газэце ў гэткай непатрэбна-вялікай колькасьці, што для простага беларускага грамадзяніна (не ўцьвеленага філёлёга) газэта становіцца нямаль-што незразумелай. І нам вядомы факты, калі на Полаччыне і Віцебшчыне зондэрфюрэры нямецкіх прапагандных установаў давалі дзеля спробы беларускаму селяніну адну з цэнтральных беларускіх газэтаў і пыталіся, ці ўсё ён разумее. Селянін прызнаваўся, што разумее мала. Тады давалі яму чытаць расейскую газэту, якую ён разумеў лепш. У выніку гэтае спробы ў гэтыя вёскі, а нават у цэлыя раёны і акругі, пачыналі накіроўваць прапагандную літаратуру выключна ў расейскай мове. Успомненую-ж цэнтральную газэту зусім не дапушчалі больш у гэтыя раёны.

Ці-ж гэта было карысна беларускаму адраджэнчаму руху? — Не! Бо гэта адкідала ад нас цэлыя раёны, якія ў выніку гэткіх філёлёгічных экспэрымэнтаў мы можамо страціць назаўсёды, як страцілі ўжо нямаль Смаленшчыну ды Браншчыну.

Няхай ня думаюць, што мы супроць чысьціні мовы і новатвораў. Яны патрэбны. Але-ж ня можна адразу пушчаць новатвор на ўсіх балонках газэты. Ён павінен уводзіцца наступова, у артыкулах стварыўшага яго аўтара, пакуль да гэтага новатвору ўсе паступова прызвычаяцца. Тут патрбны палітычны розум і такт.

Яшчэ большы палітычны такт і розум патрэбны ў балючых у нас справах конфэсыйных. Тут патрэбна сыстэматычная штодзённая праца, а не капральскі налёт з кіем і грубай лаянкай. Я не зьяўляюся клерыкалам і абаронцам архірэя Апанаса Полацка-Віцебскага, але-ж на мяне агіднейшае ўражаньне пакінулі тыя няўдалыя і нявартыя годнасьці інтэлігэнтнага чалавека прыпеўкі да кожнага з сямёх аргумэнтаў, якія дазволіў сабе напісаць наш філёлёг, што схаваўся пад псэўдонімаў С. Зэма. Гэткія прыпеўкі можа быць задаволілі-б якіх-небудзь вучняў малодшых клясаў езуіцкае кляштарнае школы 16-га, або 17-га стагодзьдзя, але выступаць з імі перад сучасным беларускім грамадзтвам проста сорам. Дужа няўдала абраны і самы псэўдонім, які ўзяты ад старога зьняважлівага слова «схізма», якім калісьці польска-каталіцкія шавіністы лаялі праваслаўных беларусоў.

Навошта гэткія выбрыкі? Каму яны патрэбны? Ці-ж гэткая лаянка дапаможа ўмацаваньню прыхільнасьці, пашаны і даверу да Беларускага Адраджэнчага руху у сэрцах беларускіх архірэяў і беларускіх праваслаўных вернікаў?

Беларускія нацыянальна-палітычныя інтарэсы вымагаюць, каб нашыя моваведы, літаратары і публіцысты ўстрымліваліся-б ад залішняга абвострываньня філёлёгічных спрэчак.

Сёньня не філёлёгічныя спрэчкі і ня дробныя гонары паасобных філёлёгаў вырашаюць далейшы лёс беларускага народу, а выключна нацыянальная еднасьць, узаемапашана, сяброўская прыхільнасьць і згода змогуць выратаваць беларускі народ ад канчатковага зьнішчэньня.

К. ЕЗАВІТАЎ.

У дапамогу настаўніку

Да Беларусі

Беларусь, жыла й жыць будзеш—
То дарма, што вораг страша,
Бо вакол не заблудзіш,
Жыве ўсюды мова наша.

А пакуль жыве ў нас мова,
Не загіне Край наш родны:
Скора жыць пачнем нанова,
Узноў, як некалі свабодна.

І нам доля, Беларусы,
Верце — міла засьмяецца,
Згінуць зьдзекі і прымусы
І няволя йзноў мінецца.

Нам засьвеціць міла сонца,
Закрасуе вакол ніва,
І па ўсёй сваёй старонцы
Жыці будзем мы шчасьліва.

Засьмяецца вясна

Засьмяецца вясна, а з блакітных нябёс
Блісьне коскамі — золатам сонца;
Уміг прагоніць зіму, што дакучыла нам,
І загляне ў наша ваконца.

Із далёкіх краёў, із-за сініх мароў
Пачнуць птушкі-пяюшкі зьбірацца.
З песьняй звонкай ляцець да старонкі сваёй,
У косках сонейка грэцца — купацца.

Ад зары да зары над загонам сваім
Жаўрук сьпевамі гожа зальлецца...
Вось і ў нашых грудзёх пад напевам вясны,
Жыва, радасна сэрца заб'ецца...

Пачакайма-ж яшчэ: прыдзе, прыдзе вясна,
Адпачынем па грозных завеях;
Лес, лагі зацьвітуць, закрасуюць палі,
З паўдня цёпленькі ветрык павее...

На прадвесьні

Шэры дзень пазірае ў вакно,
Шэры дзень, як той пух на вярбіне.
Пуста, сіне
І туманна ў палёх навакол.

[illegible]учаінамі [illegible]оняць равы
[illegible]
Гэт, высока
[illegible] даль сівую плывуць журавы.

І хоць сьнег яшчэ ў лесе ляжыць,
Хоць з-за хмар льецца жаўранка песьня,
Ужо прадвесьне
І так хочацца цешыцца й жыць!

Арлы

Стары арол вучыў маладога лятаць. Перад тым, як выпусьціць яго з гнязда, стары навучаў маладога: «Ляці памалу, але як мага найвышэй. Толькі вытрымай! Ты, арол!

Паляцелі. Вялікімі кругамі падымаліся ў паветра ўсё вышэй ды вышэй, аж пакуль прыгожа не паплылі па небе. Стары наперадзе, а малады робіць усё, як бацька, ззаду. Але малады борзда аслаб і гэтакай вышыні пачаў палохацца. Прасіўся ў бацькі дамоў. Але-ж стары не дазваляў.

— Вышэй угару! — загадваў яму сурова. Малады натужыў свае сілы, але зноў борзда пачаў ад змучэньня апускацца ўніз.

— Я ўжо болей не магу! — закрычаў ён.

— Вышэй, вышэй і толькі вышэй! Хіба ты ня сын арла? — крыкнуў стары яшчэ болей сярдзіта і сурова.

Малады замаўчаў і зноў вышэй з усіх сілаў.

Калі яны вярнуліся дамоў у гняздо, стары сказаў: — бачыш, глянь ты вытрываў аж да канца. — Але замест пахвалы, далей казаў сурова: — Цяпер перш — на перш ты сам сабе запомні, што арлу няма слова «не магу», а ёсьць толькі слова «вытрываць».

Што рабілі рыбы зімою?

Рыбы таксама спалі зімой.

Плотка, язь, чырвонапёрка, яльчык, рэраспёр, галавень, ёрш і шчупак вялікімі стаямі зімавалі ў самых глыбокіх мясцох. Язі і ляшчы — у затоках, якія зарасьлі чаротамі.

Келбы і ўклейкі спалі ў ямах з пяшчаным дном.

Карась праляжаў зіму, закапаўшыся ў іл.

У вельмі моцны мароз там, дзе ў лёдзе ня было аддушыны — палонкі, рыбе нехапала паветра — яна задыхалася.

Перазімаваўшая рыба прачнулася, вышла з ям і нератуе (выпускае ікру).

Школа для нас, а мы для школы

Наша беларуская школа яшчэ існуе ня так даўно, яна яшчэ не акрэпла, яна яшчэ маладая. Знаходзяцца нашы школы не на дзяржаўным бюджэце, а на сваім уласным. Гэты бюджэт складаецца з тых сродкаў, якія ўносяць бацькі вучняў і, зразумела, бяз гэтых сродкаў існаваць яна ня можа.

У апошнія часы наглядаецца, што ў некаторых вёсках бацькі вучняў адмаўляюцца ўносіць грошы за навучаньне сваіх дзяцей у школе і на паляпшэньне яе матарыяльнага становішча, а таксама не заўсёды сваечасова вывозяць для школы патрэбны ёй апал і неабходны для рамонту матарыял і наагул ухіляюцца ад дапамогі школе.

Толькі такія бацькі, якія не жадаюць дабра ня толькі сваім дзецям, якіх хочуць пакінуць у цемры, але і сабе, так робяць. Унасіць прыходзіцца такую мізэрную суму, аб якой ня варта і гаварыць. А між іншым, у школе дзіця атрымае пачатковую пісьменнасьць і яму будзе адчынен шлях да далейшага навучаньня.

Наша Бацькаўшчына патрабуе шмат пісьменных і адукаваных грамадзян. Гэта неабходна для яе далейшага разьвіцьця і паляпшэньня лёсу ўсіх беларусоў.

Школа—культурны асяродак на вёсцы і сувязь з ёй неабходна падтрымліваць усяму насельніцтву вёскі, незалежна ад узросту. У школе кожны можа заўсёды атрымаць параду ня толькі адносна выхаваньня дзяцей, а і наагул па ўсякім сваім уласным справам.

Добрасумленныя сяляне-беларусы не пакінуць сваіх дзяцей няпісьменнымі і не парвуць сувязі са сваёй роднай беларускай школай а ўсялякімі спосабамі будуць памагаць ёй бо цяпер не такія часы, каб мы, беларусы, маглі заставацца няпісьменнымі.

Морква

— Мама, ці хутка будзем моркву садзіць? —пытаўся Янка.

— Моркву, дзіцятка, ня садзяць, а сеюць.

— Морквачкі, мама, больш пасей!

Вось ускапалі грады, пасеялі [illegible] пу. Дае маці І Я[illegible]

— Гэта, мама[illegible] выпаўзаюць, калі іх агарнуць зям[illegible]

— Павыпаўзаюць, сынок, сей!

— Пасеяў Янка казявак, а маці прысыпала іх зямлёю. Зусім забыўся Янка аб сваіх казяўках, а з іх на градзе вырасла многа-многа зялёненькіх націнак-лісткоў. Побач з імі вырасла і зельле. Як убачыў Янка сваю зялёненькую градку, давай тады палоць. Асьцярожна вырываў зельле, морквы не чапаў: няхай ёй будзе прастарней. Няхай яе вырасьце многа, многа!

Як садзіць гароднінУ?

На градах звычайна садзяць разам: 1) моркву і буракі; 2) агуркі, цыбулю і гарбузы, 3) фасолю, гарох і боб; 4) капусту, рэпу, рэдзьку і бручку. Мак сеецца паміж радамі іншых расьлін.

Вялікае перасяленьне птушак на радзіму

Птушкі валэмі валяць зазаграніцы. Перасяленьне на радзіму ідзе ў строгім парадку, атрадамі, кожны атрад у сваю чаргу.

У гэтым годзе птушкі ляцяць да нас тымі-ж паветранымі дарогамі і ў тым-жа напрамку, якім ляцелі іх продкі тысячы год назад.

Першымі рушаць у дарогу тыя, што ўвосень паляцелі ад нас апошнімі. А п о ш н і м і— тыя, што першымі паляцелі ад нас увосень. Пазьней за іншых прылятаюць самыя яркія і стракатыя птушкі: ім трэба дачакацца сьвежага лісьця і травы. Яны вельмі прыкметныя на голай зямлі і дрэвах, і цяпер ім яшчэ не схавацца ў нас ад ворагаў—драпежных зьвяроў і птушак.

Якраз праз наш край праходзіць вялікі паветраны шлях птушак.

Адным сваім канцом вялікі птушыны шлях упёрся ў змрочны Ледавіты акіян, другім згубіўся ў квітнеючых краінах поўдня. Бясконцай чарадой, кожная ў сваю чаргу, сваім строем, ляцяць па ім нязьлічаныя стаі пералётных птушак.

На шляху іх чакаюць перашкоды і нягоды. Густыя туманы сьцяной устаюць перад крылатымі падарожнікамі. У сырым змроку птушкі губляюць дарогу, зразмаху разьбіваюцца аб вострыя нябачныя скалы.

Марскія буры ламаюць іх пер'і, зьбіваюць крыльлі, уносяць далёка.

Раптоўныя халады скоўваюць воды,—птушкі паміраюць ад голаду і сьцюжы.

Тысячы іх гінуць ад прагных драпежнікаў — арлоў, сокалаў, ястрабаў. Цэлымі стаямі драпежнікі зьбіраюцца ў гэты час на вялікі птушыны шлях, каб пажывіцца багатай і лёгкай здабычай.

Але нішто ня можа спыніць густы натоўп крылатых вандроўнікаў: праз туманы і ўсе перашкоды яны ляцяць на радзіму, да сваіх гнёздаў.

Жыцьцё лятуноў

Па начах на ўскраіны гораду і вёскі пачаліся налёты кажаноў (лятучая мыш).

Прыляцелі ластаўкі. Іх тры пароды: касатка — з доўгім хвастом-вілачкай і рыжаватай плямай на горле, варанок — з кароткім хвастом і белым горлам і берагавуша — маленькая шэравата-бурая з белымі грудзьмі.

Касатка свае гнёзды робіць у драўляных будынках на ускраінах гораду, варанок лепіць гнёзды прама на камяніцах, а берагавушка выводзіць птушанят у норках па кручах.

Хутка пасьля ластавак паявіліся і стрыжы. Іх лёгка адрозьніць ад ластавак: яны з пранізьлівым віскам кружацца над дахамі. Яны здаюцца зусім чорнымі. А крыльлі ў іх не вуглом, як у ластаўкі, а поўкругам.

Пачалі кусацца камары.

У вялікіх садах і ў кустах каля рэчак засьвісталі салаўі.

Вада ў глебе

Пасьля вялікага дажджу, або вясною, калі тае сьнег, бягуць ручаёчкі. Маленькія ручаёчкі зьбіраюцца ў большыя, большыя ў вялікія, а вялікія бягуць у возера або ў рэчку.

Але ня ўся вада пасьля дажджу ці сьнегу зьбягае ў рэчкі ды вазёры. Частка яе выпараецца ў паветра, а значная частка праходзіць скрозь зямлю ў глыбіню. Гэтая вада праходзіць па ўсіх скважынах між найдрабнейшымі часткамі глебы. Калі дождж ідзе доўга, вада насы[illegible] усю глебу і пройдзе ў глыб зямлі, і за[illegible]драбнейшых (валасяных) скваж[illegible]ах глебы. (Валасянымі гэтыя скважыны завуцца таму, што яны не таўсьцей за волас).

АКРЭСЬЛІЦЬ, КОЛЬКІ ВАДЫ Ў ГЛЕБЕ.

Колькасьць вады ў глебе акрэсьлізаецца такім чынам: насыпаць на бляшанку тонкім пластом 100 грамаў глебы, узятай з сьвежае ямы. Бляшанку з глебаю ставяць у печку, зараз пасьля таго, як вынуць хлеб. Цераз гадзіну глеба выймаецца і зноў узважваецца. Страта у вазе пакажа, колькі вады выпарылася.

Тады можна вылічыць, колькі ў глебе на 100 грамаў было вады.

ГРУНТОВАЯ ВАДА.

Дажджавая ці сьнегавая вада праз тоўшчу глебы прасочваецца да падглебных (грунтовых) парод. Яна прасочваецца праз усе пласты, якія прапускаюць ваду (пясок, вапну), зьбіраецца пад зямлёй і ўтварае там цэлыя крыніцы, вазёры, а часам і бягучыя рэчкі. Такая вада трымаецца ў ваданосных пластох, пад якімі ляжаць пароды, не прапускаючыя ваду (гліна, крэйда) і завецца г р у н т о в а ю вадою.

СТУДНІ.

З даўніх часоў людзі карыстаюцца грунтоваю вадою. Калі капаюць студню, то на некатарай глыбіні спатыкаюць ваданосны пласт, скуль вада набягае ў студню. Чым глыбей студня, тым, звычайна, вады ў ёй больш і яна чысьцей і лепей.

КРЫНІЦЫ.

Грунтовая вада не стаіць на месцы, а цячэ паціху ў той бок, куды пахіляецца ваданосны пласт. Калі-ж гэты пласт выходзіць дзе-небудзь у нізкім мейсцы наверх, або праходзіць няглыбока пад глебаю, то грунтовая вада з зямлі выцякае і творыцца к р ы н і ц а.

МІНЭРАЛЬНЫЯ КРЫНІЦЫ.

Крынічная вада, звычайна, чыстая, смачная й халодная ўлетку. Але як-бы чыстаю яна ня была, у ёй заўсёды бывае распушчана трохі солі, вапны і некаторых іншых матарыялаў.

У глебе і ў падглебных пластох заўсёды ёсьць трохі вапны і солі; а таму, што гэтыя матарыялы лёгка распушчаюцца, то яны бываюць у кожнай крынічнай вадзе.

Але ў некаторых зямных пародах знаходзіцца шмат солі, або жалеза, або серкі, або іншых падземных каменьняў і мінэралаў.

Вада, праходзячы скрозь гэтыя пласты, набірае ў сябе і распушчае гэтыя мінэралы. Такія крыніцы завуцца м і н э р а л ь н ы м і.

Некаторыя з мінэральных крыніц надта карысны чалавеку, бо лечаць яго ад розных хвароб, калі купацца ў іх або піць іх ваду.

Такімі крыніцамі зьяўляюцца, напрыклад, жалезныя, серкавыя. Асабліва многа гэтых крыніц спатыкаецца ў горных мясцовасьцях.

Каля такіх мінэральных крыніц з даўных часоў пабудаваліся гарады, або мястэчкі, куды зьяжджаюцца хворыя, такія гарады або мястэчкі завуцца здароўніцамі, або курортамі.

У нас на Беларусі знаходзіцца такі курорт у Друскеніках, дзе крынічная вада мае многа солі і іншых распушчаных мінэралаў. У Друскенікі, якія знаходзяцца недалёка Горадні, ужо даўным-даўно зьяжджаюцца хворыя, каб паратаваць сваё здароўе.

Заяц на дрэве

З адным зайцам здарылася вось што.

Заяц жыў на астраўку сярод шырокай ракі. Уначы ён абгрызаў кару з маладых дрэў, а ў дзень хаваўся ў кусты, каб ня трапіць на вочы лісу або людзям.

Гэта быў яшчэ малады, ня вельмі разумны заяц.

Ён і ўвагі не зьвяртаў, што рака вакол яго астраўка з трэскам скідала лёд.

У той дзень заяц спакойна спаў у сябе пад кустом. Сонца прыгравала яго, і касавокі не заўважыў, як вада ў рацэ пачала шпарка прыбываць. Ён прачнуўся толькі тады, калі адчуў, што скурка яго прамокла знізу.

Ускочыў, а вакол яго ўжо вада.

Пачалася паводка. Замачыўшы толькі лапкі, заяц уцёк на сярэдзіну астраўка. Там было яшчэ суха.

Але вада ў рацэ прыбывала шпарка. Астравок станавіўся ўсё менш і менш. Заяц кідаўся з аднаго канца на другі. Ён бачыў, што хутка ўвесь астравок схаваецца пад вадой, але не адважыўся кінуцца ў халодныя быстрыя хвалі: ён ня мог-бы пераплысьці разбушаваўшайся ракі.

Так прайшоў увесь дзень і ўся ноч.

У наступную раніцу з вады тырчэў толькі маленькі кавалачак астраўка. На ім расло сухое, шурпатае дрэва. Перапалоханы заяц бегаў кругом яго тоўстага ствала.

А на трэці дзень вада паднялася ўжо да самага дрэва, і заяц пачаў скакаць на дрэва, але кожны раз абрываўся і плюхаўся ў ваду.

Урэшце яму ўдалося ўскочыць на тоўсты ніжні сук. Заяц прымасьціўся на ім і стаў цярпліва чакаць канца паводкі; вада ў рацэ больш ужо ня прыбывала.

З голаду памерці ён не баяўся: кара старога дрэва была хоць вельмі цьвёрдая і горкая, але ўсё-ж у ежу прыгодная.

Значна страшней быў вецер. Ён гойдаў дрэва так моцна, што заяц ледзь трымаўся на суку. Ён быў нібы матрос на мачце карабля: сук пад ім разгойдваўся, як рэя, а ў нізе бегла халодная глыбокая вада.

Па шырокай рацэ пад ім плылі дрэвы, бярвеньні, суччо, салома і трупы жывёл.

Небарака ўвесь затросься ад страху, калі міма яго, ціха гушкаючыся на хвалях, павольна праплыў другі заяц. Ён заблытаўся лапамі ў ламаччы і доўга плыў разам з ламаччом брухам уверх, з выцягнутымі мёртвымі нагамі.

Тры дні прасядзеў заяц на дрэве.

Урэшце вада збыла, і ён скокнуў на зямлю.

Так яму і жыць цяпер сярод ракі на востраве [illegible]. Летам рака абмялее і ён дабярэцца да берагу.

Вавёрка ў лодцы

Рыбак ставіў мярэжы для лоўлі ляшчоў на залітых паводкай лугах. Ён старанна прабіраўся на лодцы праз кусты, якія тырчэлі з вады.

На адным з кустоў ён разгледзеў якісьці дзіўны рыжаваты грыб. Раптам грыб скокнуў — і прама рыбаку ў лодку.

У лодцы ён зараз-жа ператварыўся ў мокрую ўскудлачаную вавёрку. Рыбак давёз яе да берагу. Вавёрка адразу выскачыла з лодкі і ўскакала ў лес.

Як яна трапіла на куст сярод вады і ці доўга там прасядзела — ніхто ня ведае.

НАША ПОШТА

МІКАЛАЙ БЯЛЯЎСКІ з Нараўкі. Вершы Вашы мы атрымалі. Вельмі добра, што Вы чэрпаеце тэмы з свайго найбліжэйшага акружэньня. Вас захоплівае прыгожасьць раніцы, калі «ужо выразна чуваць з вёскі ржаньне й рыканьне кароў», а «сяляне вясёлай грамадой сьпяшаюць да працы йзноў». Прыгожыя раніцы над Нараўкай. Старайцеся, як кажуць, напіцца гэтай красы і пачуцьцё, якое родзіцца ў Вашай душы, перадаць у слове. А для гэтага патрэбна вобразнасьць, непасрэднасьць у выяўленьні пачуцьцяў і адчуваньняў, пэўныя мастацкія сродкі. Вазьмеце, напрыклад, верш М. Багдановіча «Зіма». Як ясна рысуецца нам марозная ноч!

«Як рызы, белыя бярозы
у сіняве начной стаяць...»

Імкнецеся да такой вобразнасьці. Чытайце! Шмат чытайце! Беларускія кнігі. Вы іх можаце атрымаць у беларускім Аб'еднаньні ў Беластоку. І... пішыце нам.

ЯНКА БОГДАН. Ліст і верш атрымалі. Выкарыстаем. Наш адказ Вы прачытаеце, пэўне, у вадным з мястэчак або сёлаў Беласточчыны. Нам здаецца, што паездка па Беласточчыне навее Вам шмат новых тэмаў і яшчэ больш узмоцніць Вас духова. Жадаем посьпеху.

Жыве Беларусь!

КАЛІНА. Прозай у Вас выходзіць лепш. Працуйце ў гэтым напрамку. Прысылайце нам раскаазы, жарты. У Вашых вершах вельмі здаровыя думкі, аднак мастацкая апрацоўка яшчэ заслабая. Вы даеце добры адказ розным шаптунам і заклікаеце да актыўнай працы сваіх братоў.

«Мо яшчэ хто баіцца
і верыць шаптунам,
дык няхай той успомніць,
што далі яны нам!?
Хвіліна прабіла!
Пара за сябе пастаяць:
За шчасьце, за волю!
Даволі нам спаць!

«Партрэт Сталіна» друкуем. Пішыце больш. З Вас будзе добры журналіст.

КАЛТОК АНДРЭЙ ува ўсходняй Прусіі. Ваш ліст мы пераслалі Дзяржаўнаму Мужу Даверу пры Нямецкім Фронце працы ў Бэрліне. Чакайце стуль адказу.

ШЫП. Ваш артыкул будзе надрукаваны з некаторымі папраўкамі ў вадным з наступных нумароў нашае газэты.

ХАМЮК ЯН у Беластоку. Радзім Вам зьвярнуцца ў Беларускае Аб'еднаньне ў Беластоку.

ЦІХОНЧУК МІКАЛАЙ з Харавы. Напішэце дакладна, у якой беларускай газэце было зьмешчана апісаньне перажываньняў у часе вайны з бальшавікамі М. Яроміга. Найлепш зьвярнуцца непасрэдна ў рэдакцыю гэтай газэты. Нам М. Яроміг невядомы.

В. Я. К. Замест разважаць ды крытычна назіраць сучасныя падзеі, чакаючы накуль нехта ня ўдарыць па галаве з таго, ці іншага боку, радзім Вам актыўна пачаць працаваць. Чаму, напрыклад, у Вашай мясцовасьці слаба настаўлена беларуская работа? Ці падумалі Вы аб тым, што і Вы ў гэтым вінаватыя? Прыгожа пісаць гэта мала! Трэба шчыра і самаахвярна працаваць для свайго народу. А Вы ўсё «вьюце» над рознымі пытаньнямі, як той Гамлет. Адно пытаньне сягоньня ў нас ёсьць: быць або ня быць. Нішто і іхто не апраўдае Вашае цясьўнасьці. Таму вось мы і не маглі здабыць незалежнасьці, што мелі падобных да Вас людзей, якія заўсёды стаялі на раздарожжы. Але, дзякаваць Богу, у нас Абдзіраловічаў ужо няма. Мы маем перад сабой ясную мэту. Мы верым у шчырасьць Вашых слоў, але яны вельмі далёкія ад сапраўднай беларускасьці.

Чаго-ж Вы, уласьціва, чакаеце? Вашае становішча мы лічым шкодным для беларускай справы. Вы пытаецеся, што нам далі або дадуць немцы? Ніхто нічога не дае. Ведайце гэта! Як насееш, так і пажнеш. Беларусі такія, як Вы, ніколі не збудуюць...

Т. К. «Шэршань, як вядома, лётае. Як-жа яго можна знайсьці?

АГРАТЭХНІК. Між іншымі рэчамі Вы незадаволены таксама артыкуламі аб сельскай Гаспадарцы ў «Новай Дарозе». Вы думаеце, што ўсё, што пішацца аб сельскай гаспадарцы ў нашай газэце, ужо даўно вядома нашым сялянам. Вы хацелі-б таму, каб мы пісалі **толькі** аб навінках аграрэхнікі. Даражэнькі калега, матарыял. які мы падаем цяпер у нашай газэце, зьяўляецца праграмай сельска-гаспадарчых 2-х гадовых школаў у Нямеччыне і наагул заграніцамі на захадзе. Дык справа па Вашаму выглядае так, што нашым сялянам там у гэт[illegible] школах ня было-б чаго сядзец[illegible] траціць. Вы забываецеся аб тым, што нашы а[illegible]тыкулы маюць сваім заданьнем даць нашым сялянам падставовыя навуковыя паняцьці аб сельскай гаспадарцы. У гэтым матарыяле яны напэўна знойдуць для сябе шмат **навінак.** Але Вы хочаце нейкіх асаблівых навінак. Калі ласка для Вас асабіста здраджу адну агратэхнічную навінку пад умовай, што Вы мне таксама асабіста адкрыеце нешта такое. Дык вось: ад даўжэйшага часу вучоныя стараюцца пры дапамозе сыстэмы трубаў выкарыстаць CO_2 з фабрыкаў на палёх.

Н. М., вучаніца V клясы Б.Н.Ш., Дабучын. Мы вельмі ўдзячны Вам за Вашы запытаньні, але яны такія абшырныя, што абыймаюць амаль поўнасьцю падставы садоўніцтва. Гэта рэч вельмі важная і цікавая для многіх гаспадароў. Таму мы пастараемся аб гэтым напісаць спэцыяльны артыкул.

Частушкі

(Запісаны ад быўшых калгасьнікаў Беласточчыны).

А як Ленін паміраў,
Сталіну прыказываў,
Каб хлеба ўволю не даваў,
сала не паказываў.

У калгасе галадоўка
і нядоля, і бяда...
Бо на полі, на калгасным
расьце толькі лебяда.

Прадсядацель з брыгадзірам
ходзяць вечна п'яныя,
а калгасьнік век працуе,
галодны й абадраны.

Як прыдзе гарача лета,
Жыд у цянёчку пасядзіць,
і паесьць, і пагуляе,
і з жыдоўкаю пасьпіць.

У нас злодзей брыгадзір,
Прадсядацель — п'яніца...
Водкай вочы заліе,
На траве расьцягнецца.

На калгас тры авечкі
[illegible] адна кароўка,
[illegible] таі,
[illegible]

Запісаў Аўген Л.

КОНКУРС
на найлепшае мастацкае беларускае апавяданьне

Беларускае Аб'еднаньне ў Беластоку абвяшчае конкурс на найлепшае беларускае апавяданьне, аповесьць і раман. У кожным творы павінна быць апрацована тэма з беларускага вызвольна-нацыянальнага руху. Творы трэба прысылаць найпазьней: 1) Апавяданьне да 30-га красавіка (прадоўжана) 2) аповесьць—да 1-га верасьня 1944 году. Удзельнічаць у конкурсе могуць усе беларускія пісьменьнікі. Творы трэба прысылаць у Беларускае Аб'еднаньне ў Беластоку (вул. Готгарда 1).

Беларускае Аб'еднаньне ў Беластоку вызначыла наступныя прэміі за найлепшыя творы: 1) за найлепшае апавяданьне—**500 РМ.** 2) за найлепшую аповесьць—**1500 РМ.** 3) за найлепшы раман — **3.000 РМ.**

Разглядаць прысланыя на конкурс творы будзе адмысловае журы, у склад якога ўвойдуць найлепшыя літаратары Беласточчыны. Творы просім прысылаць бяз подпісу, па магчымасьці надрукаваныя на машынцы. Пасьля паседжаньня конкурснай камісіі, вынікі будуць пададзеныя ў «Новай Дарозе», і толькі тады выявіць свае прозьвішчы.

АБВЕСТКІ

По ініцыятыве Беларускага Аб'еднаньня, у Беластоку адрамантавана і пушчана ў ход **л а з ь н я,** якая абслугоўвае жанчын кожны панядзелак, сераду і пятніцу, а мужчын у аўторак, чацьвер і суботу. **Л а з ь н я** мае душ і пар. Арганізуецца цырульня і буфэт.

**БЕЛАРУСКАЕ АБ'ЕДНАНЬНЕ
У БЕЛАСТОКУ**

Спадара Антона **К а н е ц к а г а** з вёскі Бьброўнікі, Вяліка-Берасьцявіцкай воласьці, Го[illegible]енскага павету або асобаў ведаючых ягоны [illegible]рас прашу падаць яго для **Ю. В.**

Сельская гаспадарка

Зялёныя гнаі

Пад зялёнымі гнаямі разумеем заворваньне зялёных, галоўным чынам матылькаватых, расьлінаў.

Зялёныя гнаі людзі ўжывалі даўно, як ведама ўжо 2000 гадоў таму назад, але гэтае ўгнаеньне пашыралася асабліва ў апошнім часе, бо яно можа нам амаль заступіць хлеўны гной. Таму з дапамогаю іх можна гаспадарваць і там, дзе мала жывёлы, а дзеля гэтага і мала хлеўнага гною.

Матылекветныя расьліны маюць іншы спосаб жыцьця, чым усе іншыя расьліны. Усе расьліны патрабуюць да жыцьця салетру. Яна вытвараецца з азоту, якога шмат у паветры: на 100 літраў паветра ёсьць 79 літраў азоту. Расьліны, аднак, ня могуць яго пабіраць з паветра, а таму ня могуць і ператварыць яго на салетру. Але ў глебе жывуць бактэрыі, якіх простым вокам ня можам бачыць. Яны пераўтвараюць азот на салетру, так, напр., як карова ператварае корм на малако. З другога боку бактэрыі ня могуць прыгатовіць сабе крахмалу, або цукру. Таму яны ідуць у нахлебнікі да матылекветных расьлінаў. Калі мы выцягнем з глебы нейкую такую расьліну: віку, боб, лубін, канюшыну і да г. п., мы пабачым на іх карэньнях маленькія барадавачкі. Пасьля разрэзу такой барадавачкі мы пабачым там пад мікраскопам шмат каморачак, а ў іх поўна бактэрый. Вось гэтыя бактэрыі і набіраюць азот з паветра, ператвараюць яго ў бялок, жывяцца ім і крахмалам расьліны і вельмі хутка размнажаюцца. Часьць іх вымірае, з іх трупаў творацца барадавачкі, багатыя бялком. Расьліны выкарыстоўваюць яго для будовы сваіх арганізмаў.

Азот ужо даўно дасьведчаныя людзі назвалі «**маторам жыцьця**», бо без яго ня могуць жыць, ані расьліны, ані жывёлы, ані людзі. Таму даставаць азот з паветра і ўводзіць яго ў глебу зьяўляецца заданьнем і мэтай кожнага разумнага гаспадара, бо ён прыносіць багацтва. Матылекветныя расьліны пакідаюць ральлі на 1 гэктары прыблізна 180 кг. азоту, які заступае нам каля 12 цэнтн. салетры. Гэтыя 12 цэнтн. салетры маем амаль дарма, ня лічачы крыху працы.

Але зялёны гной дае нам ня толькі азот. Акрамя гэтага мы абагачаем нашу глебу гумусам — перагноем. Зялёныя расьліны пакідаюць нам пасьля свайго раскладу прыблізна 150 цэнтн. гумусу на 1 гэктары. Падчас раскладу расьлінаў бактэрыі маюць шмат спажывы вельмі хутка размнажаюцца і прытэтым дыхаюць. Яны выдыхаюць вугляквіслы газ, які нам зрыхляе зямлю і памагае тварыць грудачкаватую будову глебы.

Але і гэта яшчэ ня ўсё. Матылекветныя расьліны глыбока закараняюцца, чым узрыхляюць нам падглебу, праветрываюць яе. Наступныя расьліны ў выніку гэтага могуць таксама глыбей закараняцца, што асабліва важна ў часе сухіх гадоў, калі расьліны змушаны шукаць вохкасьць у глыбейшых пластох падглебы.

Прытэтым трэба зьвярнуць увагу на наступную рэч: у багатых глебах бактэрыі дастаюць сабе ўдосталь спажывы з расьлінаў, лодырнічаюць і ня хочуць прапаваць. Таму зялёныя гнаі трэба перадусім ужываць на бяднейшых, пясчаных глебах. Гэтыя глебы маюць мала гумусу і ня могуць добра ўтрымоўваць вохкасьць. Пры ўгнаеньні хлеўным гноем на гэтых глебах мы сабе часта нават шкодзім, бо ральля яшчэ больш саграваецца: «гарыць». Падчас, калі зялёныя расьліны ральлю зацяняюць, так што вохкасьць амаль не выпароўваецца. Мала таго, расьліны маюць у сабе каля 30% вады, таму пасьля загараньня мы акрамя таго ўзбагачаем глебу вохкасьцю. Наагул, зялёнымі гнаямі, мы робім лёгкія глебы цяжэйшымі, а цяжкія лягчэйшымі.

На досьледных палёх у Нямеччыне з 1 га:
а) на глiністай глебе на зялёным гнаі з канюшыны — 392 цэнтн. буракоў,
на хлеўным гнаі — 482 цэнтн. буракоў,
б) на пясчанай глебе на зялёным гнаі з канюшыны — 237 цэнтн. бульбы,
на хлеўным гнаі — 193 цэнтн. бульбы.

На лёгкіх глебах сеем найлепей сэрадэлю, палюшку, лубін. На сярэдніх — сіні лубін, гарох, палюшку, боб, віку, канюшыну. На цяжкіх — гарох, боб, віку. Высяваць можна: а) як галоўныя расьліны, б) як міжплодныя расьліны і в) на пожні, пасьля ўборкі збожжа.

Як галоўныя расьліны высяваем вясной, а ўвосень заворваем. Прытэтым трацім тое, што ня маем тады на полі іншых расьлінаў, іншага ўраджаю. Гэты спосаб ужываем толькі тады, калі маем на полі шмат пустазельля, або глеба зусім пясчаная, плыткая і далёка ад дому.

Міжплодныя расьліны: гэтым разумеем засяваньне расьлінаў для зялёнага ўгнаеньня да галоўных расьлінаў, якімі могуць быць — жыта, або ярына. Прытэтым трэба быць вельмі асьцярожным, каб не высяваць запозна, або зарана. Гэты спосаб ужываецца галоўным чынам у горскіх мясцовасьцях, акрамя таго на цяжкіх глебах, толькі поле мусіць быць чыстае ад пырэю. Найпрактычнейшым і найлепшым спосабам ёсьць засяваньне ў збожжа. Бяда толькі ў тым, што ён не ўдаецца тады, калі маем сухое лета.

Высяваньне на пожні: гэта найлепшы спосаб, толькі вымагае шмат працы і болей насеньня. Высяваем галоўным чынам пасьля ячменю і раньняй бульбы. Толькі гэта мусім рабіць што найхутчэй на жнівах, г. зн. — не чакаць пакуль зьвязем снапы з поля, а адразу іх паставіць у дзесяткі і плытка загараць пожню, калі суха — завальцаваць і сеяць. Гэта значыць — сеяць аднача сна з жнівамі. Калі ральля ня ёсьць сухая, добра зробім, калі насеньне намочым. Калі ральля зусім сухая і няма ніякае надзеі на дождж, лепей ня сеяць.

На пожні найлепей высяваць мешаніну: палавіну конскага бобу і палавіну гароху і вікі, або толькі палавіну гароху і палавіну вікі, 100—120 кг. на морг, да гэтага можна прыдаць 50—60 кг. лубіну. Надсяваньне пад расьліны: мешаніну розных відаў канюшыны, 15 кг. на морг. Наагул на 1 морг высяваецца: сіняга і белага лубіну 130 кг. жоўтага — 100 кг., сэлядэры — 18 кг., канюшыны белай — 8 кг., чырвонай — 9 кг. дзяцеліны — 12 кг., палюшкі — 110 кг., вікі — 80 кг., конскага бобу — 120 кг. На пожні трэба высяваць найменей на адну трапіну болей. Пад лубін і сэлядэру неабходна патрусіць зямлі з бактэрыямі з таго поля, дзе яны нядаўна расьлі, калі мы хочам іх сеяць на полі, дзе яны ўжо 6 гадоў не расьлі.

ЗАВОРВАНЬНЕ ЗЯЛЁНЫХ ГНАЁЎ.

Калі мы павінны заворваць зялёныя расьліны? Калі гэта ня ёсьць пад азіміну, дык наагул тады, калі расьліны ўжо перасталі пабіраць з паветра азот. З большасьці гэта тады, калі першы мароз перарве рост расьлінаў, звычайна гэта ёсьць у канцы кастрычніка, або ў пачатку лістападу. На цяжкіх глебах заворваем 9—10 цм, на лягчэйшых 15—18 цм глыбока. Калі зялёныя расьліны вырасьлі завысока, добра іх перад заворваньнем пакасіць, або прывальцаваць.

Па зялёных гнаёх можна сеяць акрамя жыта таксама авёс, кукурузу, мак, бульбу, буракі і іншую гародніну. Пад бульбу трэба яшчэ дадаць 3—4 вазы хлеўнага гною на морг, на бяднейшых глебах акрамя таго 1,5 цэнт. паташу тіамасоўкі на морг, тое самае пад буракі.

Інж. Аграном.

Herausgeber: Weißruthenische Vereinigung in Bialystok, Gotthardstr. 1. Tel. 253. Verantwortlich für den Text: Theodor Iljaschewitsch.

Выдавецтва: Беларускае Аб'еднаньне ў Беластоку, вул. Готтгарда № 1, тэл. 253. Адказны за зьмест: Хведар Ільяшэвіч.